# Прадмова

З мэтай праверкі і ацэнкі засваення вучэбнага матэрыялу пэўнай тэмы (тэм) праводзіцца тэматычны кантроль. Пры яго ажыццяўленні ацэньваюцца дасягненні навучэнцаў не па асобных элементах, а ў лагічнай сістэме, якая адпавядае структуры вучэбнай тэмы (тэм). Для ажыццяўлення кантролю выкарыстоўваюцца метады і сродкі, з дапамогай якіх вусная, пісьмовая, практычная формы кантролю або іх спалучэнне дазваляюць атрымаць найбольш аб'ектыўную інфармацыю аб якасці адукацыйнага працэсу і выніках вучэбнай дзейнасці вучняў.

Кантрольнымі пісьмовымі работамі ў 4 класе з'яўляюцца:

- кантрольны дыктант;
- кантрольны дыктант з граматычным заданнем;
- кантрольны слоўнікавы дыктант;
- кантрольная работа па тэме;
- тэматычны рознаўзроўневы тэст.

Прадстаўленыя ў дапаможніку кантрольныя дыктанты, слоўнікавыя дыктоўкі, кантрольныя работы і тэсты ахопліваюць усе тэмы праграмы па беларускай мове для 4 класа, таму іх колькасць больш той, якая вызначаецца Інструкцыяй аб парадку фарміравання культуры вуснай і пісьмовай мовы ў агульнаадукацыйных установах, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Педагог можа выкарыстоўваць для тэматычнага кантролю любую з прапанаваных работ, а астатнія — для прамежкавага, пазаняткавага кантролю альбо для дыягностыкі з мэтай пабудовы адпаведнай карэкцыйнай работы.

Аб'ёмы прапанаваных у дапаможніку відаў кантрольных работ адпавядаюць Метадычным рэкамендацыям па фарміраванні культуры вуснай і пісьмовай мовы ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

Тэматычны кантроль прапануецца праводзіць у форме тэматычнай кантрольнай работы або ў форме тэматычнага тэсту, як прадугледжана ў «Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” ў агульнаадукацыйных установах з беларускай (рускай) мовай навучання».

Прапанаваныя складальнікам тэматычныя кантрольныя работы ўтрымліваюць 5 заданняў, якія ў поўнай меры ахопліваюць асноўны змест канкрэтнай вывучанай тэмы.

# СЛОЎНІКАВЫЯ ДЫКТАНТЫ

## Слоўнікавыя словы

Аб’язджаць, апетыт, ахвотна, балерына, берэт, вуліца, гараджане, грымец, да пабачэння, дэлегацыя, ззяць, ледзьве, меншы, памочнік, паштальён, плывец, подпіс, секунда, сёння, тэлеграма, уверсе, улетку, унізе, услых, цвісці, чацвёрты.

## Слоўнікавыя словы для кантрольных слоўнікавых дыктантаў

Тлустым шрыфтам выдзелены слоўнікавыя словы, якія вывучылі ў 4 класе на дадзены момант. Звычайным — вывучаныя ў 3 класе.

*I чвэрць:*

10 слоў: **ахвотна**, **паштальён**, **грымець**, адцвітаць, адчыніць, асцярожны, блішчаць, булён, бутэрброд, воблака.

*II чвэрць:*

10 слоў: **ледзьве**, **берэт**, **тэлеграма**, **балерына**, **плывец**, **сёння**, **улетку**, восеньскі, вулей, выйсці.

*III чвэрць:*

12 слоў: **гараджане**, **секунда**, **памочнік**, **ззяць**, **вуліца**, **цвісці**, **дэлегацыя**, **чацвёрты**, гасцінец, гарадскі, дзённік, звінець.

*IV чвэрць:*

12 слоў: **услых**, **апетыт**, **унізе**, **да пабачэння**, **подпіс**, **меншы**, **аб’язджаць**, **уверсе**, пясчаны, смяяцца, сшытак, шчасце.

# ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭКСТЫ КАНТРОЛЬНАГА ДЫКТАНТА

## I чвэрць

### Жураўлі

Жураўлі вельмі прыгожыя птушкі. Усе як адзін рослыя, дужыя, важныя. Яны найлепшыя танцоры ў птушыным свеце. Асабліва хораша жураўлі танцуюць на світанні. Збяруцца ў карагод і пускаюцца ў скокі. А колькі ў тых скоках весялосці!

Убачыць жураўлёў складана. Яны жывуць на глухіх балотах. Бацькі вучаць птушанят знаходзіць пад мохам чарвякоў, жукоў, жабак.

Восенню гаспадары балотных абшараў выпраўляюцца ў далёкае падарожжа. (61 слова)

(Паводле У. Ягоўдзіка)

- Паведаміць пра напісанне слоў: *найлепшыя, збяруцца, пускаюцца, выпраўляюцца, восенню, падарожжа*.

### Рак

Жывуць ракі ў азёрах і рэках. Хаваюцца ў норках пад карчамі ці каменнем. Спажываюць яны чарвякоў, дробную вадзяную жыўнасць, маленькую рыбку.

У рака доўгія ву́сы і сярдзітыя вочы. Клю́шні ў яго падобныя на кавальскія абцугі. Поўзае, плавае рак галавой назад. Некалькі разоў за лета ён ліняе. Панцыр лопаецца. Тоўсты гаспадар вылазіць з яго. Потым цярпліва чакае ў нары з'яўлення новай вопраткі. (62 словы)

(Паводле У. Ягоўдзіка)

Прыметнікі: ______________________________________

__________________________________________________

**4.** Выпішыце з тэксту пяць дзеясловаў. Вызначце іх спражэнне, час і лік.

Дзеясловы: ______________________________________

__________________________________________________

**5.** Выпішыце сказ па пытаннях да слоў. Разбярыце па саставе дзеяслоў у гэтым сказе.

Хто? Як? Што зрабілі? Якія? Што?

__________________________________________________

## Выніковы тэматычны кантроль — 3

### Варыянт 1

**1.** Устаўце прапушчаныя літары. Абазначце корань слоў.

Клён — кл...нок, кл...новы.
Лес — л...сок, л...снік.
Палет — пал...цеў, пал...ціць.
Стрэл — стр...ляць, стр...лок.
Шэпт — ш...птаць, ш...птуны.
Мора — м...рскі, м...ракі.

**2.** Падзяліце тэкст на сказы. Выпішыце сказ, у якім аднародныя члены звязаны інтанацыяй пералічэння.

На мосце сядзелі дзеці яны весела размаўлялі, смяяліся раптам адна дзяўчынка пахіснулася і паляцела у ваду плаваць дзяўчынка не ўмела і адразу пайшла на дно у тую ж хвіліну нехта кінуўся ў ваду гэта быў Саша ён выратаваў дзяўчынку.

__________________________________________________

**3.** Прачытайце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.

Прыйшла вясна. Скончыліся халады завеі. Снег пачарнеў заплакаў і ручайкамі збег у рэкі і азёры.

Павыходзілі на двор мужчыны, жанчыны, дзеці. Усе радуюцца цяплу і сонцу. (Паводле П. Рунца)

**4.** Згодна са схемай складзіце і запішыце сказы з прапанаваных слоў.




суніцы, буйныя, просяцца, пахучыя, ў, рот, і

________________________________________

**5.** Вызначце часціны мовы і запішыце іх над словамі. Разбярыце прапанаваныя словы як часціны мовы. Карыстайцеся памяткай падручніка.

На дрэвах пакажуцца зялёныя лісточкі.

(На) дрэвах — ____________________________

Пакажуцца — ____________________________

Зялёныя — ____________________________

## Варыянт 2

**1.** Устаўце прапушчаныя літары. Абазначце корань і анову слоў.

Мёд — м...док, м...довы.
Лёд — л...док, л...дзяш.
Сёлы — с...ло, пас...ліцца.
Трэск — тр...скучы, тр...скатня.
Мост — м...сток, м...ставы.
Рэчка — р...чулка, р...чны.

**2.** Падзяліце тэкст на сказы. Выпішыце сказ, у якім аднародныя члены звязаны інтанацыяй пералічэння.

Першымі адчуваюць дождж не пчолы, а кветкі перад дажджом яны выдзяляюць многа салодкага соку пах соку прываблівае пчол яны чародкамі ўюцца над кветкамі, спяшаюцца сабраць больш мёду у лесе кісліца таксама адчувае дождж перад дажджом яе лісточкі апускаюцца да сцябла яны быццам хочуць схавацца ад непагоды.

______________________________________________

**3.** Прачытайце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.

Была вясенняя пара, калі ўсе дрэвы стаялі, як белыя ружовыя воблакі. Млелі пяшчотныя цудоўныя пахі. Пахі гэтыя поўнілі сад вуліцу. Уся зямля, здавалася, была поўная квецені пахаў. (Паводле І. Мележа)

**4.** Згодна са схемай складзіце і запішыце сказы з прапанаваных слоў.

У што? Якія?




ласкі ў цёплыя апранаюцца футры зайцы гарнастаі

______________________________________________

**5.** Вызначце часціны мовы і запішыце іх над словамі. Разбярыце прапанаваныя словы як часціны мовы. Карыстайцеся памяткай падручніка.

Вярнуліся ў родны край птушкі.

Вярнуліся — ______________________________

(У) родны (край) — __________________________

Птушкі — ________________________________